Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2017-03-10

# АДНА ЭПОХА З 950 ГАДОЎ

## Як бачыў Лангбард: архітэктурнае аблічча Мінска ў XX стагоддзі

**Ад першай згадкі горада Мінска ў летапісах вядзецца адлік яго гісторыі — драматычнай і стваральнай, гераічнай і статусна-сталічнай. Пра апошняе можна меркаваць і паводле вонкавага аблічча горада, у якім ёсць шэраг аб'ектаў, з-за чаго Мінск не зблытаеш ні з якім іншым горадам свету. Частка аб'ектаў спраектаваная архітэктарам Іосіфам Лангбардам. Мінск і Лангбард звязаныя лёсам, таму яшчэ і выстаўкай у галерэі Міхаіла Савіцкага: яна прымеркаваная да 950-годдзя сталіцы і 135-годдзя заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, доктара архітэктуры і горадаставальніка.**

У 30-я гады мінулага стагоддзя горад набывае шэраг адметных будынкаў, якія фарміруюць яго твар: Дом урада і Вялікі тэатр оперы і балета, Дом афіцэраў (Дом Чырвонай Арміі) і галоўны корпус Акадэміі навук БССР. Будынкі, якія адпавядалі часу, якія былі вельмі патрэбныя сталіцы Рэспублікі Беларусь. Тады і зараз: лёс распарадзіўся так, што аб'екты, створаныя Іосіфам Лангбардам, перажылі Другую сусветную вайну і аднавіліся да жыцця, чаму паспрыяў і сам аўтар. Пасля вайны Іосіф Лангбард вярнуўся ў Мінск. Тое, як выглядаў тады горад, здолеў захаваць вучань Лангбарда Сяргей Святліцкі ў акварэльных малюнках. Разам са сваім настаўнікам ён прыехаў у Мінск і рабіў адказную справу: удзельнічаў у працы ўрадавай камісіі па аднаўленні разбураных вайной гарадоў Беларусі.

Падчас выстаўкі ў галерэі Савіцкага ёсць магчымасць зразумець працэс нараджэння будынкаў ад іх задумы: прадстаўлены чарцяжы і нават малюнкі інтэр'ераў, праекты па рэканструкцыі будынкаў пасля вайны. Але і гісторыя самога Іосіфа Лангбарда раскрываецца праз фотаматэрыялы з сямейнага архіва. Выстаўка арганізавана сумесна з Беларускім дзяржаўным архівам навукова-тэхнічнай дакументацыі і Прэзідэнцкай бібліятэкай Рэспублікі Беларусь. Таму ў экспазіцыі знайшлося месца і рэчам, знойдзеным на гарышчы Дома ўрада летась. Яны сведчаць пра перыяд акупацыі ў сталіцы Беларусі і толькі падкрэсліваюць вялікую жыццёвую сілу горада, здольнага залечваць раны і пісаць сваю гісторыю далей.

**Марыя АСІПЕНКА**

Марыя Асіпенка. Адна эпоха з 950 гадоў